Літаратурная класіка ў сістэме міжкультурных камунікацый

ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС, БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА, СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА, МІЖКУЛЬТУРНЫЯ КАМУНІКАЦЫІ, ЛІТАРАТУРНЫЯ ЎЗАЕМАСУВЯЗІ, КАНТЭКСТ, КУЛЬТУРА, ТЫПАЛОГІЯ ЎЗАЕМАСУВЯЗЕЙ

Літаратурная класіка ў сістэме міжкультурных камунікацый асаблівасці [Тэкст]: справаздача аб НДР (закл.): / БДПУ; кір. Мішчанчук І.М.; выкан. Адамовіч Г.Я., Мойскі А.Ч. і інш.- Мн., 2020. - 114 с., дад. - Бібліягр.: С. 89-93 (49 назв.). - № ДР 20161410.

**Аб'ект:** класічныя і сучасныя літаратурныя нацыянальныя мастацкія тэксты.
**Мэта**: распрацоўка мадэлей мадэрнізацыі і актуалізацыі беларускай і сусветнай літаратурнай класікі ў сучасным літаратурна-мастацкім кантэксце, у іерархіі адносінаў «аўтар / вытворца – твор / артэфакт – рэцыпіент / спажывец», якія ўключаюць у сябе вучэбна-выхаваўчую парадыгму і навукова-даследчы дыскурс, арыентаваны на фарміраванне асобы, на паглыбленне дыялогу паміж прадстаўнікамі розных пакаленняў, нацый, культур.
**Метады:** кампаратыўны, параўнальна-гістарычны, тыпалагічны, герменеўтычны метады аналізу мастацкіх з'яў і фактаў, метад постструктуралізму, рэцэптыўнай эстэтыкі, міфалагічнай крытыкі.
**Вынікі:** 1. літаратурны працэс павінен разглядацца як аб'ект міждысцыплінарнага дыскурса ў аспекце праблем рэцэпцыі і мадэрнізацыі літаратурнай класікі;
2. знешнімі і ўнутранымі фактарамі развіцця літаратуры з'яўляюцца алюзіі, рэмінісцэнцыі, эпігонства, запазычванне, уплывы, наследаванне, перайманне, якія выявіліся ў сецэратуры як феномене сучаснага літаратурнага працэсу, а таксама дазволілі адкрыць новыя ракурсы прачытання нацыянальнай класікі;
3. вывучана рэцэпцыя беларускай і сусветнай класікі ў творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў для распрацоўкі мадэлі мадэрнізацыі і актуалізацыі літаратурнай класікі ў сучасным літаратурна-мастацкім кантэксце;
4. праведзена даследаванне сучасных літаратурных твораў у аспекце канвергенцыі белетрыстыкі і масавай літаратуры для абнаўлення вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў па беларускай літаратуры;
5. зроблена параўнанне літаратуры ў аспекце іерархіі ўзаемаадносінаў «аўтар / стваральнік – твор / артэфакт – рэцыпіент / спажывец»;
6. вывучаны ўзаемасувязі і дыялогі паміж пакаленнямі, плынямі, напрамкамі і іх адлюстраванне на розных узроўнях мастацкага творы, праведзена даследаванне класікі і мастацтва слова мяжы стагоддзяў у аспекце міжкультурных камунікацый;
7. распрацаваны электронны адукацыйны рэсурс «Людміла Рублеўская», які выкарыстоўваецца ў вучэбным працэсе БДПУ;

8. на матэрыяле замежнай і беларускай літаратуры даследаваны наратыўныя стратэгіі ў сучаснай прозе, вызначаны асаблівасці постмадэрнісцкай паэтыкі ў найноўшай літаратуры;

9. даследавана нацыянальная літаратура XIX-XIII і XX-XXI стагоддзяў з мэтай выяўлення мадыфікацый, якія адбыліся ў тэматычным, вобразным і жанравым плане.

**Ступень укаранення**. Чытанне лекцый і правядзенне практычных і семінарскіх заняткаў па дысцыплінах «Гісторыя беларускай літаратуры», «Сучасны літаратурны працэс», «Сусветны літаратурны працэс», «Параўнальнае літаратуразнаўства», «Тэорыя літаратуры», «Увядзенне ў літаратуразнаўства»,«Літаратурная крытыка», падрыхтоўка семінараў, стварэнне вучэбных і метадычных дапаможнікаў. Распрацоўка выкарыстоўвалася ў вучэбным працэсе кафедры беларускай і замежнай літаратуры БДПУ (акт аб укараненні, пратакол № 7 от 29.01.2020 г.).

**Галіна выкарыстання.** Далейшае развіцце літаратуразнаўства, параўнальнага вывучэння сусветных літаратур з мэтай пашырэння міждысцыплінарных даследаванняў, а таксама ўдасканалення адукацыйнай сістэмы ў Беларусі.